# Прамова У. Е. ЛАБАНКА

Дарагія таварышы! Жыхары слаўнай беларускай сталіцы! Нашы паважаныя госці! Баявыя сябры, ветэраны вайны—франтавікі і партызаны!

Радаснае свята прыйшло ў гарады і вёскі нашай тройчы ардэнаноснай рэспублікі—споўнілася 25 гадоў з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Чым далей адыходзяць ад нас падзеі Вялікай Айчыннай вайны, чым ярчэй, тым паўней і больш велічна паўстаюць перад намі бессмяротныя подзвігі савецкіх людзей, здзейсненыя ў жорсткай барацьбе з карычневай чумой гітлерызму.

Сабраўшыся сёння на плошча Леніна, прывяла нас праз усе ваенныя выпрабаванні да сусветна-гістарычнай перамогі. Выхаваныя і загартаваныя Камуністычнай партыяй, савецкія людзі праявілі ў барацьбе з фашызмам нябывалыя ў гісторыі цуды масавага гераізму, мужнасці і самаахвяравання.

У барацьбе з фашызмам загінуў кожны чацвёрты жыхар Беларусі. Тры гады лютавалі акупанты ў гарадах і вёсках рэспублікі. Яны ўсталявалі рэжым крывавага тэрору і насілля.

Фашысты разбурылі і спалілі звыш двухсот нашых гарадоў і гарадскіх пасёлкаў, больш як дзевяць тысяч сёл і вёсак, знішчылі і разграбілі фабрыкі і заводы.

це творчых сіл. Пад кіраўніцтвам партыі Леніна ў дружнай сям'і брацкіх народаў беларускі народ упэўнена ідзе да камунізма.

Залечаны раны вайны. Але мы не можам і ніколі не залечым нашых душэўных ран. У памяці народнай заўсёды будуць жыць тыя, хто крывёй і жыццём сваім заплаціў за нашу свабоду. Не сціхне ў нашых сэрцах глыбокі боль па бацьках і маці, старэйшых братах і сёстрах, нашых баявых сябрах, якія загінулі ад фашысцкіх рук.

Гітлераўцы, насаджаючы свой так званы «новы парадак», учынялі самыя жудасныя злачынствы над савецкімі людзьмі. Яны ўшчэнт знішчалі вёскі, заганялі жыхароў у дамы, хлявы і жывымі спальвалі старых, жанчын, дзяцей.

Злавесная трагедыя адбылася там 22 сакавіка 1943 года, калі банда эсэсаўцаў паварварску спаліла ўсе 26 дамоў гэтай вёскі разам з жыхарамі. Населены пункт быў сцёрты з твару зямлі.

Няма і не можа быць даравання тым, хто ператвараў у магілкі нашы мірныя паселішчы. Бязвінныя ахвяры напамінаюць нам аб тым, што фашызм — пад якой бы маскай ён ні выступаў, — гэта заўсёды смерць і разбурэнні, прыгнёт і бяспраўе.

Таварышы! Па рашэнню Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі і ўрада рэспублікі на месцы спаленай ворагам Хатыні створан мемарыяльны комплекс, які ўвекавечыць памяць гэтай і ўсіх іншых вёсак Беларусі, спаленых разам з людзьмі фашыстамі. Сёння там будзе

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы